**Агульныя звесткі аб арганізацыі дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь і аб нацыянальнай прававой сістэме**

Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляецца на аснове падзелу яе на:

- заканадаўчую;
- выканаўчую;
- судовую.

Дзяржаўныя органы ў межах сваіх паўнамоцтваў самастойныя. Яны ўзаемадзейнічаюць паміж сабой, стрымліваюць і ўраўнаважваюць адзін аднаго.

Адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца народ.

Народ ажыццяўляе сваю ўладу праз прадстаўнічыя і іншыя дзяржаўныя органы, так і непасрэдна ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй краіны.

Дзяржава, усе яе органы і службовыя асобы дзейнічаюць у межах Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і прынятых ў адпаведнасці з ёй актаў заканадаўства. Тым самым сцвярджаецца і рэалізуецца прынцып вяршэнства права.

Вышэйшай каштоўнасцю і мэтай грамадства і дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляюцца чалавек, яго правы, свабоды і гарантыі іх рэалізацыі.

Сістэма органаў дзяржаўнай улады краіны ўключае ў сябе:

- Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (Кіраўніка дзяржавы);
- Парламент (Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь: Савет Рэспублікі і Палату прадстаўнікоў);
- Урад (Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь);
- суды;
- пракуратуру;
- Камітэт дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь;
- органы мясцовага кіравання.